**Праект**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік адзела па адукацыі Докшыцкага райвыканкама
А.А.Кучыц

________________ 2026 г

УМОВЫ
правядзення раённага злёту юных краяведаў

АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Дадзенае палажэнне вызначае ўмовы і парадак правядзення раённога злёту юных краяведаў.

У адпаведнасці з пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.12.2025 № 06-01-14/14750/дс і пісьмом галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага абылвыканкама ад 22.01.2025 № 01-01-87/1791 з мэтай фарміравання ў навучэнцаў грамадзянска-патрыятычных пачуццяў сродкамі экскурсійнай музейнай дзейнасці праводзіцца раённы злёт юных краяведаў устаноў адукацыі. У адпаведнасці з гэтым з мэтай дэманстрацыі краязнаўчых дасягненняў і актыўнага ўцягвання ў экскурсійную дзейнасць пад час злёту будзе праведзенны раённы этап рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі.

Асноўнымі задачамі конкурсу з’яўляюцца:

фарміраванне ў дзяцей і моладзі каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі і культуры малой радзімы;

папулярызацыя гісторыка-культурных і прыродных адметнасцей малой радзімы сродкамі экскурсійнай дзейнасці;

папулярызацыя дзейнасці музеяў устаноў адукацыі;

выяўленне і заахвочванне лепшых юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі;

развіццё творчых здольнасцей, садзейнічанне прафесійнаму самавызначэнню навучэнцаў, набыццё камунікатыўных навыкаў праз экскурсійную дзейнасць.

АРГАНІЗАТАРЫ

Арганізатарамі злёту з’яўляецца аддзел па адукацыі Докшыцкага раённага выканаўчага камітэта і ДУДА “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”. Агульнае кіраванне і метадычнае забеспячэнне ажыццяўляе ДУДА “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”.

## УДЗЕЛЬНІКІ

Удзельнікамі злёту з’яўляюцца навучэнцы агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі ва ўзроставай катэгорыі ад 13 да 18 гадоў (юныя экскурсаводы музеяў, музейных пакояў установ адукацыі (індывідуальна).

## ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ

Злёт пройдзе ў вочным фармаце **21 лютага 2026 года** на базе Бягомльскага музея народнай славы.

Конкурсныя матэрыялы і заяўкі ўдзелу ў злёце дасылаюцца да 17 лютага 2026 года ў электронным выглядзе (cdt_doksh@mail.ru)

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ

Конкурс праводзіцца ў двух намінацыях: “Музей” і “Музейны пакой” у два туры.

У першым туры (завочны) удзельнікі конкурсу прадстаўляюць відэаролік “Тры прычыны зазірнуць у музей/ музейны пакой” ( да 5 хвілін). У відэаролiку юныя экскурсаводы ствараюць уласны наратыў вакол музейных матэрыялаў, раскрываюць тры значныя прычыны наведаць музей/музейны пакой, дэманструюць навыкі музейнай камунікацыі.

Другі тур будзе праходзіць у час злёту.

Удзельнікі конкурсу намінацыі “Музей” прадстаўляюць аглядальную экскурсію “Голас мінуўшчыны” (да 7-мі хвілін) у выглядзе выставы свайго музея на 10м$^2$ і больш. Канкурсанты знаёмяць з музеем установы адукацыі ад імя асобы імі выбранага персанажа. Персанажам можа быць любы чалавек мінулага, чый лёс, прафесія, або дзейнасць маюць прамое дачыненне да музейных матэрыялаў і якія могуць дапамагчы юным экскурсаводам зрабіць выступленне эмацыйна яркім.

Удзельнікі конкурсу намінацыі “Музейны пакой” прадстаўляюць віртуальную экскурію “Па сцяжынкам малой радзімы” (да 7-мі хвілін). Канкурсанты знаёмяць з цікавымі адметнасцямі свойго краю. Віртуальная экскурсія ўключае ў сябе метадычныя прыёмы паказу аб'ектаў і аповяд пра іх і падзеях, звязаных з імі, а таксама галасавога суправаджэння. Можа быць выканана ў фармаце Power Point або відэароліка.

Колькасць аб’ектаў падчас правядзення экскурсіі не абмяжоўваецца. Пры правядзенні экскурсіі могуць выкарыстоўвацца розныя мастацкія сродкі эмацыйнага ўздзеяння (касцюмы, музычнае суправаджэнне і інш.).

Асноўныя крытэрыі ацэнкі экскурсійнага прадстаўлення:

- значнасць прадстаўленных прычын для наведвання музея, музейнай комнаты;
- змест і інфарматыўнасць;
- лагічнасць і цэласнасць наратыву;
- камунікатыўныя навыкі, уменне захапіць увагу гледача, выразнасць мовы;
- адпаведнасць агляднай (ці тэматычнай) экскурсіі;
- змястоўнасць, інфарматыўнасць;
- лагічнасць пераходаў для аб’яднання матэрыялу экскурсіі ў адзінае цэлае;
- прыцягненне ўвагі да музея, наяўнасць у экскурсіі элементаў рэкламы;
- спалучэнне паказа і расказа;
- культура мовы;
- займальнасць, крэатыўнасць, артыстызм;
- прытрымліванне хранаметражу.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

Пераможцы і прызёры раённага этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі будуць узнагароджаны ў кожнай намінацыі дыпломамі I, II, III ступені аддзела па адукацыі Докшыцкага райвыканкама.

Пераможца раённыга этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі будзе накіраваны на абласны этап (абарона таксама будзе праходзіць у вочным фармаце).

## ФІНАНСАВАННЕ

Набыццё дыпломаў пераможцам і прызёрам раённага этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі (6 штук), а таксама арганізацыя падвоза ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту прадугледжаных на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў.

Савулова 59791